Flag нам в руки
СПЕЦИАЛЬНЫЙ ВЫПУСК
Газета ученического коллектива
Каменского УПК д/с-СШ
ЧЕТВЕРГ, 12 ноября 2020 года №22



Ян, Янка (Іван Аляксеевіч) Скрыган – беларускі пісьменнік, паэт, навеліст, нарысіст, публіцыст і крытык. Карыстаўся псеўданімамі Відук, Я. Відук, Ян Відук, Янка Відук, Крушына, Я. Крушына, Пірат, Аўлас і Дзед Аўлас (разам з П. Броўкам).

Нарадзіўся 16 лістапада 1905 году ў вёсцы Труханавічы (цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці) ў сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у мясцовай царкоўнапрыходскай школе, потым вучыўся ў Слуцку ў Беларускай гімназіі і сельскагаспадарчым тэхнікуме. Вялікі ўплыў на сведамасць юнака зрабілі кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі.

У 1924 годзе Ян Скрыган стаў супрацоўнікам слуцкай акруговай газеты "Вясковы будаўнік". Пасля пераехаў у Расоны, працаваў загадчыкам Народнага дома пры выканкаме, пасля ў рэдакцыі газеты "Чырвоная Полаччына", дзе пазнаёміўся з Петрусём Броўкам.

# 115 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНА СКРЫГАНА

У 1932-ым скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне БДУ. Быў сябрам літаратурных аб'яднанняў "Маладняк" і "Літаратурна-мастацкая камуна". Працаваў у рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва".



Члены рэдкалегіі акруговай газеты “Чырвоная Полаччына”.
Злева направа: Сцяпан Сямашка, Паўлюк Шукайла,
Пятрусь Броўка, Янка Відук (Скрыган). Полацак, 1927 г.

Дэбютаваў Ян Скрыган вершамі ў 1925 г. Малады паэт падпісваўся незвычайнымі псеўданімамі: Пірат, Відук, Янка Відук. Пазней сам тлумачыў іх сэнс: "Пірат" мае разбуральна-рэвалюцыйную ідэю пераменаў, "Відук" – сімвал неадольнага жыццесцвярджэння, так на Случчыне называюць дзікі мак-самасейку. Першыя паэтычныя спробы створаны пад уплывам вельмі прыкметнай фігуры ў літаратурным жыцці 20-х гадоў – Паўлюка Шукайлы, які быў гарачым прыхільнікам футурызму.

Творчы шлях Скрыгана-празаіка пачаўся з апавядання "Таіса" (1927) і аповесці "Затока ў бурах" (1929). Пераход да прозы быў няпросты. Ад некаторых іншых маладнякоўцаў Ян Скрыган адрозніваўся арыентаванасцю на традыцыю, вострым адчуваннем мовы, любасцю да роднага слова, імкненнем вучыцца, а не вучыць.

Актыўная грамадская і літаратурная дзейнасць была раптоўна спынена: 13 лістапада 1936 году Яна Скрыгана беспадстаўна арыштавалі за "контррэвалюцыйную дзейнасць" і асудзілі на дзесяць год пазбаўлення волі з высылкай у Сібір (Кемераўскую вобласць). У 1946-ым ён быў вызвалены, аднак пазбаўлены грамадзянскіх правоў на пяцігадовы тэрмін. Працаваў на пасадзе бухгалтара на гідролізным заводзе ў Фергане, на сланцахімічным камбінаце ў Эстоніі, куды пераехаў, каб быць бліжэй да роднай Беларусі, дзе яму было забаронена жыць. 25 чэрвеня 1949 г. зноў арыштаваны і высланы ў Сібір, у Сухабузімскі раён, дзе працаваў бухгалтарам у райкамгасе і МТС. У снежні 1954 г. з Яна Скрыгана былі зняты ўсе абвінавачанні, і ён быў поўнасцю рэабілітаваны і адноўлены ва ўсіх правах. Пасля вяртання ў Мінск пісьменнік актыўна ўключыўся ў літаратурную дзейнасць: працаваў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, літкансультантам Саюза пісьменнікаў, рэдактарам і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Полымя".

Як добры знаўца мовы быў запрошаны галоўным рэдактарам выдавецтва "Беларуская савецкая энцыклапедыя" Броўкам на пасаду загадчыка літаратурна-кантрольнай рэдакцыі (1967-1975). Працаваў адказным сакратаром камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Скрыган умеў шчыра радавацца чужому творчаму поспеху, з радасцю падтрымліваў маладых. Калі бачыў нешта вартае – дапамагаў, спрыяў, чым мог. Яму прыносілі і дасылалі вельмі шмат рукапісаў літаратараў-пачаткоўцы. Часта ездзіў выступаць у рэгіёнах. Асаблівую ўвагу звяртаў на мову. Пісаў Ян Скрыган да апошняга свайго дня. Не стала пісьменніка 18 верасня 1992 г., пахаваны ён на Паўночных могілках сталіцы.



Ян Скрыган з дачкой Галачкай (фота да другога арышту).
Ківіылі (Эстонія), 1949 г.
З хатняга архіва Я. Скрыгана.

Пасля ссылкі за кароткі тэрмін пісьменнік апублікаваў цэлы шэраг празаічных зборнікаў, цэнтральнай тэмай якіх было захаванне і ўзбагачэнне духоўных рэсурсаў чалавека – “Апавяданні” (1956), “Наталя” (1957), “Няпрошаная сляза” (1958), “Скажы адно слова” (1961). У 1964 г. да свайго шасцідзесяцігоддзя Ян Скрыган выдаў зборнік “Свая аповесць”, у аснове якога – памяць, што з’яўляецца галоўным сувязным звяном гісторыі. Кніга расказвае пра аўтара, яго творчасць і пра сучаснікаў. Яна – добры прыклад “спавядальнага” пісьма, дзякуючы якому пісьменнік здолеў суаднесці свой уласны жыццёвы досвед з жыццём іншых людзей і такім чынам стварыць шырокую і дынамічную карціну жыцця Беларусі XX ст. Няпросты лёс Яна Скрыгана найперш праглядаецца ў творах “Парог” і “Свая аповесць”, дзе ён перадаў некаторыя моманты сваёй няпростай біяграфіі. Рознае зведаў аўтар на сваім вяку – і светлае, радаснае, і змрочнае, горкае, драматычнае, але і ў тых умовах збярог душэўную далікатнасць і шчодрасць, добразычлівасць і веру ў чалавека.

Мастацкая вартасць скрыганаўскай “малой” прозы не ў яе сюжэтнай займальнасці – яна кранае душу псіхалагічнай дакладнасцю, асаблівай атмасферай, калі з чытачом не проста гавораць, а гавораць усёй душою. Неяк Ян Скрыган сказаў:

“Не трэба мудрагеліць і штукарыць. Пішы, як ходзіш. Галоўнае ў літаратуры – свая ўласная паходка”.

І яго паходку заўважылі многія. У 1975 г. выйшаў яго Збор выбраных твораў у 2 т., перавыдадзены ў 1985 г.



Ян Скрыган у ссылцы. Дзень шахцёра. Другі злева Ян Скрыган з дачкой Галяй на руках.
Сухабузім Краснаярскага краю (Сібір), 1952 г.
З хатняга архіва Я. Скрыгана.

У нашай школе знаходзіцца музей “Бацькаўшчына”, у якім арганізавана пастаянная экспазіцыя, прысвечаная знакамітаму пісьменніку. Вялікую дапамогу ў арганізацыі экспазіцыі музея аказала дачка пісьменніка Галіна Іванаўна Скрыган. Яна перадала рэчы, якім мог бы пазайздросціць сталічны музей: асабістыя прадметы Яна Скрыгана, арыгіналы дакументаў і рукапісаў, фотаздымкі. У музеі захоўваецца рабочы стол пісьменніка і славутыя скрыганаўскія кіёчкі, якія той вырабляў сам і дарыў сябрам-калегам, а таксама – шахматы, найлюбімейшая яго гульня. А яшчэ – медалі, граматы і ўзнагароды, атрыманыя за адданую літаратурную і навуковую працу пасля вяртання дадому.





Экспазіцыя, прысвечаная Яну Скрыгану ў гісторыка-краязнаўчым музеі “Бацькаўшчына”

Для ўшанавання памяці Яна Скрыгана шмат робіць і дачка пісьменніка Галіна Скрыган. Дзякуючы яе намаганням былі ўпарадкаваны архівы, да кожнага юбілею пісьменніка ёй падрыхтаваны асобныя выданні.



Галіна Скрыган



Рабочы стол Яна Скрыгана, з экспазіцыі музея

За некалькі год Галіна Скрыган выдала шэраг кніг: выбраныя творы ў серыі “Беларускі кнігазбор” (2005), “Ян Скрыган ва ўспамінах” (2010), дзённікі Яна Скрыгана “Сэрцу горкая далячынь” (2013) і зборнік успамінаў “Добра, што я іх ведаў” (2014), а таксама “Фоталетапіс з сямейнага архіва Яна Скрыгана” (2020). Менавіта апошнюю кнігу Галіна Іванаўна падаравала Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

# Літаратурны вечар “Кругі лёсу Яна Скрыгана” прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

12 лістапада ў бібліятэцы адбылося мерапрыемства, прымеркаванае да 115-годдзя з дня нараджэння Яна Скрыгана (1905–1992) – беларускага пісьменніка, сябра літаратурнага аб’яднання “Маладняк”.




Літаратурны вечар быў арганізаваны ў межах сумеснага праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця”, які рэалізуецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Выдавецкім домам “Звязда” (у прыватнасці, часопісам “Маладосць”) і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва да 100-годдзя літаб’яднання “Маладняк”. Сумеснымі намаганнямі ўдзельнікаў праекта быў падрыхтаваны віртуальны раздзел, прысвечаны юбілею пісьменніка, у межах праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця” на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

З прывітальным словам на вечары выступіў Алесь Суша, намеснік генеральнага дырэктара – дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Ён расказаў пра маштабны сумесны праект, яго дзейнасць, розныя формы папулярызацыі віртуальнага праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. А гэта імпрэзы, адкрытыя лекцыі, круглыя сталы і іншыя ініцыятывы. Як прыклад, правядзенне анлайн-конкурсу чытальнікаў “О, Беларусь, мая шыпшына” да 120-годдзя У. Дубоўкі, які набірае папулярнасць і на сённяшні дзень стаў міжнародным. У межах праекта праводзілася і падрыхтоўка да юбілея выдатнага беларускага пісьменніка Яна Скрыгана, які сваёй творчасцю, лёсам, шчырым служэннем Радзіме варты таго, каб яго памяталі.

З прэзентацыяй новага віртуальнага раздзела, прысвечанага 115-годдзю Яна Скрыгана, выступіла Таццяна Лаўрык – загадчыца інфармацыйна- аналітычнага аддзела. Яна пазнаёміла гасцей с рэсурсам, які змяшчае поўныя тэксты кніг аўтара, каштоўныя дакументы, фотаздымкі і архіўныя матэрыялы з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, партнёраў праекта, а таксама з дамашняга архіва самога Івана Аляксеевіча Скрыгана. У заключэнні яна расказала пра гісторыка-краязнаўчы музей “Бацькаўшчына” (кіраўнік І.І. Тагіль; а.г. Камень Капыльскага раёна), у якім размешчана экспазіцыя, прысвечаная земляку, вядомаму пісьменніку Капыльшчыны. Наведвальнікі пазнаёміліся з прэзентацыяй, якую музей пераслаў для знаёмства з каштоўнымі дакументамі і рэчамі пісьменніка, што захоўваюцца на яго малой радзіме.






Неацэнны ўклад у стварэнне сардэчнай атмасферы вечарыны ўнесла выступленне Галіны Скрыган, дачкі пісьменніка, якая распавяла пра свайго бацьку, пра захаванне сям'ёй спадчыны і ўшанаванне памяці Яна Скрыгана. На мерапрыемстве яна расказала пра ўкладзеныя ёю кнігі з творамі пісьменніка і ўспамінамі пра яго і прэзентавала новае выданне – ілюстраваны альбом "Фоталетапіс з хатняга архіва Яна Скрыгана" (2020), кніга была перададзена ў дар бібліятэцы. Вельмі сімвалічна, як адлюстраванне повязі пакаленняў, на літаратурным вечары быў прагледжаны відэазапіс з музычнай кампазіцыяй – прысвячэнне дзядулю ад Яна Скрыгана- малодшага, унука пісьменніка, вядомага выканаўцы твораў на класічнай гітары, які зараз жыве пад Фрайбургам (Германія).




Добры настрой імпрэзы падтрымала выступленне Кастуся Цвіркі, галоўнага рэдактара выдавецтва "Кнігазбор", аўтара праекта "Беларускі кнігазбор", які рыхтаваў аднатомнік выбраных твораў Скрыгана ў гэтай серыі. Ён расказаў пра выхад у выдавецтве кніг "Добра, што я іх ведаў", "Сэрцу горкая далячынь" і іншых, якія з'яўляюцца выдатным прыкладам ушанавання пісьменніка. У сваім выступленні ён узгадаў першае знаёмства з сям'ёй Яна Скрыгана, сваю сумесную працу з Галінай Скрыган па падрыхтоўцы гэтых кніг.

Літаратурны вечар быў завершаны выступленнем Яўгена Жука, загадчыка аддзела алічбоўкі дакументаў, які з дзяцінства ведаў сям'ю Яна Скрыгана.

Напрыканцы вечара госці былі запрошаны да прагляду выставкі, прысвечанай юбілею пісьменніка.

Flag нам в руки
Газета ученического коллектива Каменского УПК д/с - СШ

223914, Копыльский район, аг. Камень, ул. Школьная, 2
8017(17) 49-2-17

Главный редактор
Тагиль Дарья Дмитриевна

Выходит 1 раз в месяц
Тираж 30
Распространяется бесплатно